УДК 008:[325.14(476):28]

# ЭТНАКУЛЬТУРНАЯ ПАЛІТЫКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ЯК ФАКТАР САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ АДАПТАЦЫІ НОСЬБІТАЎ МУСУЛЬМАНСКАЙ КУЛЬТУРНАЙ ТРАДЫЦЫІ

**М. А. Татарэвіч,**
*аспірант кафедры культуралогіі БДУКМ*

Паступіў у рэдакцыю 30.01.19.

UDC 008:[325.14(476):28]

# ETHNO-CULTURAL POLICY OF THE REPUBLIC OF BELARUS AS A FACTOR OF SOCIO-CULTURAL ADAPTATION OF THE CARRIERS OF THE MUSLIM CULTURAL TRADITION

**M. Tatarevich,**
*Post-Graduate Student of the Department of Cultural Studies, BSUCA*

Received on 30.01.19.

У артыкуле вызначаны асноўныя напрамкі этнакультурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь і іх уздзеянне на адаптацыю суб'ектаў мусульманскай супольнасці. Яго змест раскрываецца ў асноўным на прыкладзе такіх кірункаў, як развіццё этнакультурнай адукацыі і выхавання, інфармацыйнае забеспячэнне палітыкі, арганізацыйная і матэрыяльная падтрымка культурных пачынанняў і мастацкіх калектываў, а таксама прапаганда культурных дасягненняў праз арганізацыю фестываляў і мерапрыемстваў. Таксама абагульнена прававая база Рэспублікі Беларусь у сферы нацыянальна-дзяржаўных і міжнацыянальных адносін, барацьбы з распальваннем нацыянальнай, расавай ці рэлігійнай нянавісці.
*Ключавыя словы:* сацыякультурная адаптацыя, міжкультурная камунікацыя, этнакультурная палітыка, носьбіты мусульманскай культурнай традыцыі.

The article defines the main directions of the ethnocultural policy of the Republic of Belarus and their impact on the adaptation of the subjects of the Muslim community. Its content is revealed mainly on the example of such areas as the development of ethnocultural education and upbringing, information support for politics, organizational and material support for cultural initiatives and artistic groups, as well as promotion of cultural achievements through the organization of festivals and events. Also the legal framework of the Republic of Belarus in the sphere of national-state and international relations, combating the incitement of national, racial or religious hatred are summarized.
*Keywords:* sociocultural adaptation, intercultural communication, ethno-cultural policy, carriers of the Muslim cultural tradition.

Узаемадзеянне паміж людзьмі з рознымі культурнымі традыцыямі з'яўляецца прыярытэтным кірункам сучасных культуралагічных даследаванняў. Рэспубліка Беларусь – шматнацыянальная дзяржава, на яе тэрыторыі пражываюць каля 9,5 млн чалавек. Назапашаны вопыт сумеснага пражывання ў сферы міжкультурных зносін, адметнасць узаемапранікнення культурных традыцый і сталі прадметам навуковага асэнсавання ў дадзеным артыкуле.

Сучасная сацыякультурная сітуацыя ў многім абумоўлена глабалізацыйнымі працэсамі, якія вядуць да трансфармацыі ўсёй сферы беларускага грамадства. Разам з размываннем нацыянальна-культурнай адметнасці выкрышталізоўваецца інтэнцыя да захавання сваёй культуры і тэарэтычнага асэнсавання яе лакальных адметнасцей. У першую чаргу гэта выяўляецца праз цікавасць да вывучэння жыццядзейнасці розных этнасаў, іх ладу жыцця і светапогляду.

Асаблівае месца ў шматнацыянальнай супольнасці займаюць носьбіты мусульманскай культурнай традыцыі. Згодна з апошнім перапісам, іслам у краіне вызнаюць каля 27 народаў, што складае больш за 30 000 чалавек (татары, азербайджанцы, туркмены, узбекі, казахі, таджыкі, башкіры, туркі, афганцы, чачэнцы, аварцы, абхазы, кыргызы, даргінцы, караімы і інш.) [1]. Калі параўнаць колькасць прадстаўнікоў мусульманскай культурнай традыцыі з папярэднімі перапісамі (1989, 1999 гг.), то стала больш азербайджанцаў, арабаў, асецін, таджыкаў, туркмен, але паменшылася колькасць татараў. Мусульманская супольнасць сёння з'яўляецца важнай часткай беларускага грамадства. Далейшае развіццё мусульманскай

культуры і духоўнасці дазволіць вялікай колькасці беларускіх мусульман камфортна існаваць у талерантным грамадстве.

Улічваючы той факт, што з кожным годам павялічваецца колькасць мігрантаў з мусульманскіх дзяржаў, праблема сацыякультурнай адаптацыі мусульман надзвычай актуальная ў сучасным беларускім грамадстве. Вялікую ролю на працэсы іх адаптацыі аказвае такі фактар, як этнакультурная палітыка Рэспублікі Беларусь.

Дзяржаўнае кіраванне этнакультурнай сферай ажыццяўляецца па наступных напрамках: развіццё этнакультурнай адукацыі і выхаванне, інфармацыйнае забеспячэнне палітыкі, арганізацыйная і матэрыяльная падтрымка культурных пачынанняў і мастацкіх калектываў, а таксама прапаганда культурных дасягненняў праз арганізацыю фестываляў і мерапрыемстваў.

Прававую базу Рэспублікі Беларусь у сферы нацыянальна-дзяржаўных і міжнацыянальных адносін, барацьбы з распальваннем нацыянальнай, расавай ці рэлігійнай нянавісці складаюць Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь; законы Рэспублікі Беларусь «Аб нацыянальных меншасцях Рэспублікі Беларусь», «Аб палітычных партыях», «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь», «Аб грамадскіх аб'яднаннях», «Аб друку і іншых СМІ»; Крымінальны кодэкс, артыкулы Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністратыўных правапарушэннях і іншыя законы.

Заканадаўства Беларусі грунтуецца на міжнародных нарматыўных актах: «Дэкларацыя правоў асоб, якія належаць да нацыянальных ці этнічных, рэлігійных і моўных меншасцей», ухваленая ААН у 1992 г.; «Канвенцыя ў абарону нацыянальных меншасцей», прынятая Саветам Еўропы ў 1995 г. У справе забеспячэння праў нацыянальных супольнасцей Беларусь заключыла міжнародныя пагадненні з Літвой, Украінай, Расіяй, Польшчай і іншымі краінамі.

Мэты этнакультурнай палітыкі ўвасабляюцца ў заканадаўчых нормах і рэалізуюцца на практыцы праз дзейнасць кампетэнтных дзяржаўных структур у адукацыйнай, інфармацыйна-асветніцкай і культурнай сферах. Функцыі ажыццяўлення палітыкі ў сферы этнакультурнага развіцця ў Рэспубліцы Беларусь былі ўскладзены на Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі, Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей (з 2002 г. – Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей, з 2006 г. – Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей і яго апарат) і іх структурныя падраздзяленні.

У пачатку XXI ст. кіраўніцтвам краіны былі вызначаны прынцыпы ажыццяўлення дзяржаўнай этнакультурнай палітыкі. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка у сваіх выступленнях неаднаразова падкрэсліваў, што ў Беларусі ёсць даўнія традыцыі бесканфліктнага суіснавання прадстаўнікоў розных этнасаў, якія падтрымліваюцца дзяржаўнай палітыкай, дзяржавай створаны спрыяльныя ўмовы для захавання і развіцця духоўных традыцый усіх людзей, якія жывуць у Беларусі [2, с. 56].

Важным інструментам рэгулявання сферы культуры з'яўляецца распрацоўка і ўдасканаленне нарматыўна-прававой базы. Кожны год у многія заканадаўчыя акты ўносяцца змены і дапаўненні. Дзейнасць дзяржаўных органаў, якія ажыццяўляюць рэгуляванне і кіраванне ў галіне культуры, скіравана на стварэнне ўмоў для адраджэння і развіцця гістарычных традыцый народнай творчасці.

Адным з асноўных прынцыпаў ажыццяўлення культурнай дзейнасці з'яўляецца свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцей, якія пражываюць у нашай дзяржаве. Грамадзяне, якія належаць да любой нацыянальнай супольнасці і пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, маюць права захоўваць і развіваць сваю нацыянальную культуру, выхоўваць дзяцей у нацыянальных культурных традыцыях, карыстацца роднай мовай. Таксама яны маюць права на стварэнне ў Рэспубліцы Беларусь грамадскіх аб'яднанняў, якія ажыццяўляюць культурную дзейнасць [3].

Аб'яднанні з'яўляюцца важным фактарам захавання этнарэлігійнай ідэнтычнасці мусульман. Часта суайчыннікі з'яўляюцца для іх галоўным асяродкам нефармальных зносін, эмацыйна і сімвалічна вельмі важных. Падобны характар сацыяльных сувязяў з'яўляецца крыніцай узнаўлення звыклага ўніверсуму значэнняў, інтэрпрэтацый і ацэнак з'яў рэчаіснасці і выступае сродкам падтрымання легітымнасці звыклай формы сацыяльных інстытутаў.

Неабходна адзначыць і ролю традыцыйнага калектывізму ўсходніх народаў у захаванні мусульманскай ідэнтычнасці ў беларускім грамадстве. Зараз на тэрыторыі Беларусі дзейнічаюць аб'яднанні татараў – «Аль-Кітаб» (Гродна, Мінск), Міжнародны фонд развіцця татара-башкірскай духоўнай спадчыны «Чышма» (Мінск); аб'яднанне чувашоў – «Атал» (Гродна); аб'яднанні азербайджанцаў – «Азер-

Рэпазіторый БДПУ

байджанская абшчына «Азеры» (Магілёў), «Габустан» (Мінск), «Кангрэс азербайджанскіх абшчын» (Мінск); дагестанцаў – «Ачаг» і «Гора» (Мінск); сірыйцаў – «Сірыйская абшчына» (Мінск); афганцаў – «Афганская абшчына» (Мінск); казахаў – «Елімай» (Мінск); туркменаў – «Бахар» і інш.

Адным з важнейшых кампанентаў этнакультурнай палітыкі з'яўляецца адукацыя і выхаванне нацыянальных супольнасцей. Этнакультурная адукацыя нацыянальных меншасцей у пачатку XXI ст. ажыццяўлялася ў наступных формах: навучанне на мове нацыянальнай супольнасці, вывучэнне этнакультурнага кампанента ў асобных класах агульнаадукацыйных школ, дашкольных установах, факультатыўна ў гуртках, а таксама ў нядзельных школах. Трэба адзначыць, што этнакультурныя традыцыі ў мусульман захоўваюцца на роднай мове, аднак пісьмовая традыцыя губляецца, таму што школ навучання няма на іх мовах. У асноўным выхаванне ў сям'і падтрымлівае веданне мовы ў вуснай форме, аднак пісьмовая страчваецца.

Пазашкольная этнакультурная адукацыя ў XXI ст. існуе ў форме гурткоў і школ выхаднога дня, якія дзейнічаюць як на базе дзяржаўных устаноў культуры і адукацыі, так і пры грамадскіх аб'яднаннях нацыянальных супольнасцей. Агульная колькасць нядзельных школ год ад года ўзрастае, павялічваецца таксама і колькасць нацыянальных супольнасцей, якія развіваюць этнакультурную адукацыю ў такой форме. У 2000 г. на базе дзяржаўных устаноў адукацыі і культуры функцыянавала больш за 50 школ выхаднога дня, у якіх сваю родную мову вывучалі каля 3,5 тысяч прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей рэспублікі [4, с. 37]. А ў 2006 г. на базе дзяржаўных устаноў адукацыі і культуры функцыянавала 66 школ выхаднога дня, 16 нацыянальных супольнасцей, якія наведвалі каля 5 тысяч чалавек [5, с. 4]. У Мінску ў Цэнтры творчасці дзяцей і моладзі «Эўрыка» для афганскіх дзяцей працуюць гурткі па вывучэнні рускай мовы, мовы дары, а таксама гісторыі і культуры Афганістана. Таксама існуе школа выхаднога дня пры Міжнародным грамадскім аб'яднанні «Палясцінская абшчына», у ёй вывучаюць арабскую мову, гісторыю і культуру Палясціны. Пры Пасольстве Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь адкрыта школа выхаднога дня, дзе дзеці і дарослыя вывучаюць казахскую мову, гісторыю і культуру казахскага народа. У татарскім аб'яднанні «Зікр уль-Кітаб» існуе не толькі школа выхаднога дня, але і бібліятэка, відэатэка і фільматэка ў памяшканні мячэці ў Мінску. З 2005 г. курсы турэцкай мовы можна наведваць пры аб'яднанні «Дыялог Еўразіі» [6].

Важным фактарам захавання этнакультурнай ідэнтычнасці мусульман у Беларусі з'яўляюцца мусульманскія летнія лагеры: некаторыя з іх праводзяцца ў Іўі і Навагрудку [7]. Засваенне базавых элементаў мусульманскай традыцыі адбываецца ў асноўным праз далучэнне да рэлігійнай культуры. Дзеці наведваюць мячэць, пазнаюць асновы ісламскай рэлігіі, што садзейнічае іх інтэграцыі ў мусульманскую супольнасць.

Мячэць для мусульман з'яўляецца прасторай, на якой сінтэзуюцца розныя формы не толькі рэлігійнай, але і этнічнай культуры. У храме ў канцэнтраваным выглядзе прадстаўлена іх адметнасць. Ёсць усе падставы разглядаць мячэць як тэкст культуры беларускіх мусульман. Семантычнае багацце інтэр'еру і экстэр'еру мячэці садзейнічае асабістаму спасціжэнню духоўных каштоўнасцей, уплывае на фарміраванне суб'екта культуры.

Мячэці з'яўляюцца цэнтрамі захавання і трансляцыі мусульманскай культуры на беларускіх землях. На сённяшні дзень у Беларусі дзейнічаюць дзевяць мячэцей: у Слоніме, Навагрудку, Смілавічах, Відзах, Клецку, Лоўчыцах, Маладзечне, Іўі, Мінску. У Мінскай саборнай мячэці існуе нядзельная школа для прадстаўнікоў мусульманскай культуры. Сёння актывізацыя храмавага будаўніцтва з'яўляецца сродакам захавання этнаканфесіянальнай адметнасці мусульман, адраджэння іх духоўнай спадчыны, таму што храм становіцца грунтам набыцця чалавекам сваёй этнічнай ідэнтычнасці, на аснове якой адбываецца культурная ідэнтыфікацыя асобы і яе развіццё.

Адным з дамінантных фактараў адаптацыі мусульманскай супольнасці з'яўляюцца камунікатыўныя сродкі. Інфармацыйна-асветніцкі аспект этнакультурнай палітыкі ўключае распаўсюджванне ў грамадстве інфармацыі аб падзеях культурнага жыцця нацыянальных супольнасцей, іх гісторыі і традыцыях, мерапрыемствах па падтрымцы фальклору і народных рамёстваў. Інтэрв'ю з кіраўнікамі грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей, рэпартажы з нацыянальных святаў, фестываляў нацыянальных культур і фальклору, конкурсаў народных рамёстваў публікуюцца ў беларускіх перыядычных выданнях: газетах «Голас Радзімы», «Культура», «Савецкая Беларусь», «Рэспубліка», часопісах «Мастацтва», «Беларускі патрыятычны часопіс».

Рэпазіторый БДПУ

У эфіры Першага тэлеканала Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі ў 1999–2006 гг. раз у тыдзень выходзіла 30-хвілінная перадача «Шматгалоссе: народы Беларусі: гісторыя, культура, побыт», на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё – перадачы «Супольнасць», «Нацыянальная палітра», «Братэрства», у якіх асвятлялася культурная дзейнасць аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей Беларусі [8].

Да 2002 г. на Беларускім тэлебачанні існавала фальклорная тэлепраграмма «Запрашаем на Вячоркі», затым выступ фальклорных калектываў можна было ўбачыць у перадачы «Спявай, душа!», якая выходзіла на Першым Нацыянальным канале і тэлеканале «Лад». Па першай праграме Беларускага радыё да 2002 г. па суботах выходзіў у эфір радыёклуб «Фальклор», у далейшым з'явіліся фальклорныя праграмы «Музычны атлас» і «Радавод», у праграмах рэгіянальнага тэле- і радыёвяшчання таксама знаходзілася месца для фальклорнай тэмы і культуры нацыянальных супольнасцей.

Зараз, на жаль, рэзка скарацілася колькасць такіх праграмм, аднак назіраецца павелічэнне інфармацыі пра мусульманскую супольнасць у прасторы інтэрнэта. У сацыяльных сетках існуюць группы: «Іслам у Беларусі», «Мусульмане Беларусі», «Беларускія татары – нашчадкі Залатой Арды» і інш. Цікавыя звесткі аб мусульманах можна знайсці на сайце Islam.by.

У 2001 г. Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь сумесна з Рэспубліканскім цэнтрам нацыянальных культур быў выдадзены зборнік артыкулаў і дакументаў «Нацыянальныя супольнасці у Беларусі», у якім была змешчана падборка матэрыялаў аб дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў азербайджан, татараў, украінцаў, яўрэяў, малдаван, іх нацыянальных традыцыях і святах. Перад правядзеннем III, IV і VI Усебеларускіх фестываляў нацыянальных культур пад эгідай Міністэрства культуры, Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей, Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур выйшлі даведнікі з інфармацыяй аб удзельніках мастацкіх калектываў. У 2005 г. пабачыў свет буклет-даведнік «Беларусь шматнацыянальная», у якім папулярна распавядалася пра гісторыю, традыцыі, святы, кухні тых народаў, якія заснавалі ў нашай краіне свае аб'яднанні. Неабходна адзначыць, што падобныя публікацыі спрыялі распаўсюджанню ў грамадстве аб'ектыўных ведаў пра жыццё і традыцыі розных нацыянальнасцей.

Многія аб'яднанні нацыянальных меньшасцей маюць свае асабістыя перыядычныя выданні, на старонках якіх друкаваліся матэрыялы пра гісторыю і культуру дадзенага народа, асвятлялася бягучая дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей («Байрам», «Жыццё», «Аль-Джыхад», «Аль-Іслам» – татарскія, «Габустан» – азербайджанскае, «Садай Афган» – афганскае і інш.). Выданне некаторых з іх ажыццяўлялася за кошт Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей.

У 2000-х гг. у Беларусі склалася сістэма свят і фестываляў народнай творчасці, мэтай якіх была прапаганда лепшых узораў народнага мастацтва. У шэрагу фестываляў практыкаваўся і ўдзел фальклорных калектываў і калектываў мастацкай самадзейнасці нацыянальных супольнасцей Беларусі. Так, у 2001 г. рамках культуралагічнага праекта «Траецкі кірмаш» 5 мая прайшло выступленне этнакультурных аб'яднанняў азербайджанцаў, дагестанцаў [9].

У канцы 2003 – першай палове 2005 г. у краіне прайшоў Другі Усебеларускі фестываль народнага мастацтва «Беларусь – мая песня», які быў прысвечаны 60-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне [10]. Удзел у фестывалі прымалі як народныя майстры і фальклорныя калектывы, так і ўдзельнікі іншых формаў мастацкай самадзейнасці (усяго каля 30 тысяч калектываў, больш за 500 тысяч удзельнікаў). Фестывальныя мерапрыемствы праходзілі ва ўсіх рэгіёнах і сталіцы Беларусі.

Асноўнай формай папулярызацыі песеннага і танцавальнага мастацтва нацыянальных супольнасцей Беларусі на дадзеным этапе рэалізацыі этнакультурнай палітыкі стаў Усебеларускі фестываль нацыянальных культур, які праводзіцца ў г. Гродна. Неабходна адзначыць, што на постсавецкай прасторы аналагаў дадзенага фестывалю ў Беларусі не было. І тое, што ён стаў традыцыйным і разам з тым самым маштабным з усіх афіцыйных святочных мерапрыемстваў этнакультурнай накіраванасці, якія праводзяцца ў рэспубліцы, пацвярджае правільнасць і своечасовасць прыняцця рашэння аб рэалізацыі арыгінальнага праекта. Пачынаючы з 1996 г., фестываль адбываецца ў г. Гродна раз на два гады і працягваецца паўтара гады (Першы (1996 г.), Другі (1998 г.), Трэці (2000 г.), Чацвёрты (2001–2002 гг.), Пяты (2003–2004 гг.), Шосты (2005–2006 гг.), Сёмы (2007–2008 гг.), Восьмы (2009–2010 гг.), Дзявяты (2011–2012 гг.), Дзясяты (2013–2014 гг.), Адзінаццаты (2015–2016 гг.)

Рэпазіторый БДПУ

і Дванаццаты (2017–2018 гг.)). Колькасць удзельнікаў такіх мерапрыемстваў з кожным годам узрастае. Пастаяннымі ўдзельнікамі фестывалю з'яўляюцца наступныя мусульманскія супольнасці: татарская, азербайджанская, дагестанская, казахская, афганская, башкірская, туркменская і інш. Правядзенне падобных фестываляў дазваляе прадстаўнікам нацыянальных меншасцей паказаць шырокай публіцы свае культурныя традыцыі і звычаі, а таксама выступае адным з важных фактараў падтрымання культурнай разнастайнасці беларускага грамадства. Фестываль нацыянальных культур – гэта сімвал яднання нацый, народнасцей, духоўнай разнастайнасці нацыянальных культур.

Так, неабходна адзначыць, што ажыццяўленне этнакультурнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь спрыяе захаванню міжнацыянальнай згоды ў грамадстве; забеспячэнню спрыяльных умоў для развіцця традыцыйнай культуры беларусаў і культур нацыянальных супольнасцей.

Сярод эфектыўных напрамкаў рэалізацыі этнакультурнай палітыкі вылучаюцца наступныя: распрацоўка нарматыўна-прававой базы і галіновых праграм; развіццё этнакультурнай адукацыі і выхавання; інфармацыйна-асветніцкая дзейнасць; садзейнічанне этнакультурнаму развіццю на рэгіянальным узроўні; папулярызацыя і распаўсюджванне этнакультурных традыцый у беларускім грамадстве праз фэсты, выставы, конкурсы. Найбольшая ўвага дзяржаўнымі органамі надаецца развіццю сферы этнакультурнай адукацыі і мастацкай творчасці.

Такім чынам, у Рэспубліцы Беларусь створаны ўсе ўмовы для паспяховай адаптацыі носьбітаў мусульманскай культурнай традыцыі. Гэта абумоўлена дзяржаўнай палітыкай, скіраванай супраць дыскрымінацыі ў дачыненні да іншамоўнага, іншакультурнага ці інаканфесіянальнага насельніцтва. На міжнародным узроўні ісламска-хрысціянскі дыялог грунтуецца выключна на прынцыпах раўнапраўя, талерантнасці і ўзаемапавагі, без якіх немагчыма вырашэнне тых надзённых праблем рэлігійна-ідэалагічнага характару, якія стаяць сёння перад чалавецтвам. У нашай рэспубліцы не існуе ніякіх антаганістычных супярэчнасцей паміж хрысціянскай і ісламскай рэлігіямі, якія маглі б ускладніць канструктыўны дыялог прадстаўнікоў дзвюх найбуйнейшых культурна-каштоўнасных сусветных традыцый. Прыведзены прыклад суіснавання хрысціянства і мусульманства на тэрыторыі Беларусі пераконвае ў магчымасці гарманічнага развіцця абедзвюх рэлігій у рамках адной дзяржавы, адной гістарычнай супольнасці. Культурная палітыка стварае ўмовы для захавання, развіцця этнакультурнай традыцыі нацыянальных меншасцей, аднак гэтыя магчымасці не ў поўнай меры выкарыстоўваюцца суб'ектамі мусульманскай супольнасці, і гэта таксама культуралагічная праблема.


Літаратура

1. Перепись населения 2009 : стат. зборник: в 3 т. / Нац. стат. ком-т Респ. Беларусь ; редкол.: В. И. Зиновский (пред.) [и др.]. – Минск : РУП «Информационно-вычислительный центр Национального статистического комитета Республики Беларусь», 2011. – Т. III : Национальный состав населения Республики Беларусь. – 433 с.
2. Государство для народа : Доклад Президента Республики Беларусь А. Г. Лукашенко // Государство для народа : документы и материалы Третьего Всебелорусского собрания, 2–3 марта 2006 г., Минск ; редкол.: А. Н. Рубинов [и др.]. – Минск : Беларусь, 2006. – С. 9–74.
3. Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб культуры у Рэспубліцы Беларусь» : Закон Рэсп. Беларусь, 18 мая 2004 г., № 282-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2004. – № 87. – 131 с.
4. *Ходар, Н. В.* Национально-культурное развитие национальных общностей республики и межнациональные отношения / Н. В. Ходар // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва : нав.-інф. зб. / Нац. бібліятэка Беларусь. – Мінск, 2001. – Вып. 1. – С. 35–42.

References

1. Perepis naseleniya 2009 : stat. zbornik: v 3 t. / Nats. stat. kom-t Resp. Belarus ; redkol.: V. I. Zinovskiy (pred.) [i dr.]. – Minsk : RUP "Informatsionno-vychislitelnyy tsentr Natsionalnogo statisticheskogo komiteta Respubliki Belarus", 2011. – T. III : Natsionalnyy sostav naseleniya Respubliki Belarus. – 433 s.
2. Gosudarstvo dlya naroda : Doklad Prezidenta Respubliki Belarus A. G. Lukashenko // Gosudarstvo dlya naroda : dokumenty i materialy Tretyego Vsebelo-russkogo sobraniya, 2–3 marta 2006 g., Minsk ; redkol.: A. N. Rubinov [i dr.]. – Minsk : Belarus, 2006. – S. 9–74.
3. Ab unyasenni zmyanennyau i dapaunennyau u Zakon Respubliki Belarus „Ab kultury u Respublіki Belarus" : Zakon Resp. Belarus, 18 maya 2004 g., № 282-З // Nats. reyestr pravovykh aktov Resp. Belarus. – 2004. – № 87. – 131 s.
4. *Khodar, N. V.* Natsionalno-kulturnoye razvitiye natsionalnykh obshchnostey respubliki i mezhnatsionalnyye otnosheniya / N. V. Khodar // Aperatyunaya infarmatsyya pa prablemakh kultury i mastatstva : nav.inf. zb. / Nats. bibliyateka Belarus. – Mínsk, 2001. – Vyp. 1. – S. 35–42.


Рэпазіторый БДПУ

5. *Гуляко, Л.* Республика Беларусь – страна межнационального мира и согласия / Л. Гуляко // Абарона правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей Рэспублікі Беларусь / Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2006. – С. 3–5.
6. Беларусь шматнацыянальная / [пераклад : А. Содоль, М. Ягорава, В. Калацкая ; аўтар уступнага артыкула Л. П. Гуляка]. – Мінск : Рыфтур, 2015. – 107 с.
7. Мусульманский летний лагерь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://minaret.by/ru/Мусульманский-летний-лагерь/. – Дата доступа: 13.12.2016.
8. *Макрушич, Е. Н.* Этнокультурная политика в отношении национальных меньшинств в Республике Беларусь (1995–1998 гг.) / Е. Н. Макрушич // Весн. Гродз. дзярж. ун-та імя Я. Купалы. Сер. 1. – 2008. – № 1. – С. 49–56.
9. *Адамовіч, Я.* Кірмашы народнай творчасці ў Троецкім прадмесці / Я. Адамовіч // Культура. – 2001. – № 31. – С. 12–14.
10. Беларуская культура сёння: гадавы агляд, 2005 / Мін-ва культур Рэсп. Беларусь, Бел. дзярж. інстытут праблем культур ; навук. рэд. І. Б. Багачова. – Мінск : БелДІПК, 2005. – 316 с.

5. *Gulyako, L.* Respublika Belarus – strana mezhnatsio¬nalnogo mira i soglasiya / L. Gulyako // Abarona pravou asob, yakiya nalezhats da natsyyanalnykh supolnastsey Respubliki Belarus / Savet Ministrau Respubliki Belarus, Upaunavazhany pa spravakh religiy i natsyyanalnastsey. – Mínsk : Entsyklapedyks, 2006. – S. 3–5.
6. Belarus shmatnatsyyanalnaya / [peraklad : A. Sodol, M. Yagorava, V. Kalatskaya ; autar ustupnaga artykula L. P. Gulyaka]. – Minsk : Ryftur, 2015. – 107 s.
7. Musulmanskiy letniy lager [Elektronny resurs]. – Rezhym dostupa: http://minaret.by/ru/Musulmanskiy-letniy-lager/. – Data dostupa: 13.12.2016.
8. *Makrushich, Ye. N.* Etnokulturnaya politika v otnoshenii natsionalnykh menshinstv v Respublike Belarus (1995–1998 gg.) / Ye. N. Makrushich // Vesn. Grodz. dzyarzh. un-ta imya Ya. Kupaly. Ser. 1. – 2008. – № 1. – S. 49–56.
9. Adamovich, Ya. Kipmashy narodnay tvorchastsi u Troyetskim pradmestsi / Ya. Adamovich // Kultura. – 2001. – № 31. – S. 12–14.
10. Belaruskaya kultura syonnya: gadavy aglyad, 2005 / Min-va kultury Resp. Belarus, Bel. dzyarzh. instytut prablem kultur ; navuk. red. I. B. Bagachova. – Minsk : BelDIPK, 2005. – 316 s.


Рэпазіторый БДПУ